РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Грынчык М.М.**, *прафесар*

# ПРАБЛЕМА ГУМАНІЗМУ Ў ЯЕ ГІСТАРЫЧНЫХ АБРЫСАХ

Гуманізм як канцэптуальная аснова беларускай нацыянальнай літаратуры сфарміраваўся ў старажытны перыяд. Вытокі яго - у тых шматвяковых ідэйна-эстэтычных прынцыпах, што былі выпрацаваны на працягу многіх папярэдніх стагоддзяў і што арганічна звязаны з самабытнай ментальнасцю народа, выяўленай у фальклоры, з яго адвечным маральным кодэксам.

Ядром гэтай велізарнай спадчыны становіцца прапаведзь высокіх гуманістычных ідэалаў, ідэалаў чалавекалюбства і свабоды.

Зразумела, што на пачатковым этапе зараджэння беларускай літаратуры (Х-ХШ стст.) гуманізм гэты набываў выразны хрысціянска-рэлігійны змест; ён непарыўна звязаны з асноўнымі прынцыпамі хрысціянскай этыкі і маралі (прамовы К.Тураўскага, жыційная і паломніцкая літаратура). Гэтая плённая гуманістычная традыцыя яскрава прасочваецца ў шматлікіх беларускіх летапісах і хроніках у перыяд станаўлення Вялікага княства Літоўскага ў XIV-XV стст. Сам працэс кансалідацыі феадальных княстваў, цэнтралізацыя палітычнай улады на землях Беларусі і Літвы ва ўмовах узмацнення польска каталіцкай экспансіі пасля Крэўскай і асабліва Люблінскай уніі ўспрымаецца і матывіруецца гістарычнай неабходнасцю абароны хрысціянства ад нарастання ваеннай агрэсіі з боку іnaверцаў. Найбольш паслядоўна і ўзнёсла гэтыя тэндэнцыі выявіліся ў славутай героіка-патрыятычнай паэме М.Гусоўскага «Песня пра зубра»(1523):

Гіне народ, а яму, з'яднанаму верай Хрыстовай,
Трэба, каб мір для жывых запанаваў на зямлі.
Нашым князям, каралям прыўдаў ты развяжную
кемнасць.
Дапамажы зразумець, дзе яны здрадзілі нам.
Ёсць абавязак. Яны ж уладай сваёй злоўжываюць,
Стражы па назве, а так. сутнасць іх - зграя
ваўкоў!

Рэлігійна-гуманістычныя матывы старажытнага лацінамоўнага пісьменства істотна развіты ў эпоху беларускага Адраджэння, асабліва ў культурна-асветніцкай дзейнасці Ф.Скарыны. Зыходзячы з рэлігійна-хрысціянскіх прынцыпаў, Скарына прыметна паглыбіў сваё разуменне чалавечых адносін у тагачасным грамадстве, прыдаў яму характар рэнесанснай завершанасці, гуманістычнай накіраванасці. У аснову грамадскага прагрэсу ён паклаў дэмакратычны прынцып асветы «люду



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паспалітага», прынцып грамадскай гармоніі, рэлігійнай талерантнасці.

Духоўнае аблічча чалавека, створанага «па вобразу і падабенству Божаму», абумоўлена рэальнымі гістарычнымі і жыццёвымі абставінамі, пачуццём этнічна-нацыянальнай прыналежнасці. Менавіта абараняючы родны горад, царыца Юдзіф рызыкуе сваім жыццём, свядома ідзе на вялікае «небяспечэнства».

Гэтая патрыятычна-гуманістычная канцэпцыя Скарыны свой плённы працяг знаходзіць у палемічнай літаратуры канца XVI - пач. XVII стст. У прадмовах С.Буднага, В.Цяпінскага і інш. яна выяўлена ў апраўданні справядлівых абарончых войнаў, абароне роднай мовы і культуры. Аднак рэлігійная палеміка, асабліва на этапе Контррэфармацыі і пашырэння уніяцтва, паступова набывае аднабаковы схаластычны характар, перарастаючы ў адкрытую варожасць і крайні экстрэмізм. Зусім натуральна, што ў такіх умовах прыметна слабее гуманістычны пафас тагачаснага беларускага пісьменства, яго ўплыў на свядомасць і духоўную культуру народа.

Найбольш адкрыта гэты спад выявіўся ў творчай дзейнасці С.Полацкага, што прыводзіць да занядбання роднай мовы, да выразнай ідэалізацыі манархічнага ладу, услаўлення ваеннай сілы і захопніцкіх войнаў пад шыльдай атаясамлівання рэлігійных і нацыянальных інтарэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ